**Альшэўская, Т.** Там, за ракой... / Т. Альшэўская // Родныя вытокі (Докшыцы). — 2009. — 18 лют. — С. 1—2.

## ТАМ, ЗА РАКОЙ…

*Для Васіля Лібозы Дзень Перамогі – двайное свята. У 1965-м годзе 9 мая ў 11 гадзін у радзільным доме на рукі яго маці акушэрка падала нованароджанага хлопчыка. «У такі святы дзень нарадзіўся, не ведаць бы яму ніколі, што такое вайна», – сказала тады яна. А ўсё атрымалася наадварот.*

Дзень 9 мая 1983 года выдаўся, як і амаль заўсёды, сонечным і цёплым. З раніцы ў вёсцы чулася музыка, прыбраныя па-святочнаму вяскоўцы накіроўваліся адзін да аднаго ў госці. Вёска Вольберавічы ў вайну напакутавалася, і таму Дзень Перамогі святкавалі і стары, і малы. Толькі ў хаце Лібозаў зачопа была са слязамі на вачах.

Маці збірала сына ў ваенкамат. Старалася ўсміхацца, а слёзы самі ліліся з вачэй, бацька трымаўся, толькі курыў цыгарэту за цыгарэтай.

Васька іх вырас хлопцам на зайздрасць: высокі, статны, здаровы, медкамісію ў ваенкамаце прайшоў без адзінай заўвагі. Прызначылі яго ў аўтабат, а там – хто яго ведае... Не дай бог у Афганістан. Кажуць, што ўжо прывозяць адтуль нашых хлопчыкаў у чорных трунах, ад гэтых думак у бацькоў стыла кроў. А Васіль весяліўся. Маладосць! Ці ж яна здатная доўга сумаваць?

Будучымі армейскімі вадзіцелямі яны даехалі да Віцебска, а там з прызыўнікоў адабралі групу самых рослых, фізічна падрыхтаваных – і на Ашхабад. Пачуўшы пра гэты горад, ужо ніхто не сумняваўся ў сваім далейшым лёсе. Пяць месяцаў з іх рыхтавалі салдат, якія здольныя дзейнічаць у баявых умовах. «Пяць месяцаў, а там – за раку», – чулі яны не раз ад інструктараў, і кожны пры гэтым думаў: «А што там, за той ракой?» А там была вайна. Цяжкая, брудная, недарэчная. На ёй не было франтоў, перадавой і тылу. Адзін і той жа кішлак з раніцы быў нашым, увечары – душманскім, а назаўтра – наадварот. Духі хаваліся ў гарах, у кішлаках за дуваламі, нападалі, як зграя ваўкоў, на калоны, баявыя размяшчэнні нашых войскаў, падпільноўвалі асобныя групы салдат і знішчалі. Яны былі гаспадарамі становішча, бо знаходзіліся на сваёй зямлі і прытулкам ім быў кожны камень у гарах, кожны сцяпны пагорак. І зараз, як жывы, стаіць перад вачыма Саша Катаеў. Сябра, з якім паўтара года дзялілі і кусок хлеба, і патрон. Загінуў, калі ў бой, шкадуючы маладых, пайшлі старaслужачыя. У Растове зараз дзве вуліцы носяць імя Катаева. Адна ў гонар бацькі, які ваяваў у Вялікую Айчынную, другая ў гонар сына-воіна афганскай вайны. Рота 180-га асобнага стралковага палка 40-й арміі, дзе служыў Лібоза, займалася «праводкай» калон з боепрыпасамі, зброяй, харчамі. Ці трэба казаць, як за гэтымі калонамі палявалі душманы? Таму кожны салдат роты быў элітнай баявой адзінкай. Колькі прыйшлося перажыць сутычак з духамі, зараз не ўспомніць. У адной у яго амаль пад нагамі ўзарвалася граната. Атрымаў асколачнае раненне бядра. Са шпіталя зноў вярнуўся на службу. У апошнім баі перад дэмабілізацыяй атрымаў кулявое раненне, зацiснуў рану рукой і тут убачыў, як паваліўся камандзір узвода лейтэнант Аляксандр Званароў. Камандзір хоць і малады, але быў сапраўдным бацькам салдатам, шкадаваў і не адпраўляў іх без неабходнасці пад агонь. А з Лібозам ён наогул сябраваў.

Васіль, адчуваючы, як сам слабее, падпоўз да ўзводнага, узваліў яго, што раптам стаў непад'ёмным, на сябе і папоўз пад акампанемент куль. Часам здавалася, што зараз сам страціць

прытомнасць, але ўсё абыходзілася. Сілы пакінулі толькі тады калі выпаўз сам і вынес з-пад агню камандзіра, якога перадаў на рукі земляку Мікалаю Войнічу.

За гэты подзвіг сяржант Васіль Лібоза быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Вайны гэтай не хацелі савецкія людзі, але салдат ёсць салдат і яго галоўны доўг – выконваць дадзеную воінскую прысягу. Здрада, шкурніцтва з'яўляюцца злачынствамі на любой вайне. Не абмінулі яны і афганскую. Двое салдат з іх падраздзялення перайшлі на бок душманаў. Адзін быў труслiўцам, другі ратаваўся ад суда. Лёс першага невядомы, а другі стаў камандзірам 30-і душманаў і з жорсткай ярасцю рэзаў сваіх былых баявых сяброў. За ім доўга ганяліся добраахвотнікі, бо ваенныя вынеслі свой прысуд, ды д'яблу ў чалавечым абліччы шанцавала.

Афганская мужнасць, абвостранае пачуццё справядлівасці і жаданне пакараць зло засталіся з ім і ў мірным жыцці. Калі жыў у Віцебску, пайшоў сустракаць з работы жонку. Убачыў, як двое на вуліцы напалі на суседа. Кінуўся на дапамогу і атрымаў нож у жывот. Калі трэба, то і зараз Васіль Віктаравіч прыйдзе на дапамогу любому пакрыўджанаму.

Дэмабілізаваўся ён у 1985-м. Потым яшчэ з месяц «хадзіў» па начах у атакі, імгненна расплюшчваў вочы, як толькі чуў самы маленькі шорах, а рука адразу хапала нябачныя бронежылет і аўтамат. З часам гэта прайшло, як і псіхоз вайны, які ў кожнага, хто прайшоў Афган, выяўляўся па-рознаму. Зараз яны жывуць сваёй памяццю і баявым сяброўствам. Хутка гадавіна іх палка, хто зможа, паедзе ў Маскву, і з гэтай нагоды не змаўкаюць па начах тэлефоны ў Піцеры, Растове, Каломне, Віцебску, Докшыцах. Ветэраны Афгана шукаюць адзін аднаго, бо немагчыма забыць сябра, які прыкрываў цябе сваім целам ад куль.

**Т. Альшэўская**